**Алена Касінская**



Галоўны бібліёграф
Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі

# Інфармацыйныя рэсурсы Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі аб чарнобыльскай катастрофе: да 25-годдзя з дня аварыі на Чарнобыльскай АЭС

Мінула чвэрць стагоддзя з часу аварыі на Чарнобыльскай атамнай электрастанцыі, якая адбылася 26 красавіка 1986 г. Краіны свету спасцігла найбуйнейшая з тэхнагенных катастроф XX стагоддзя. Перад чалавецтвам паўсталі праблемы, якія закранаюць усе сферы жыцця, не ведаюць ні тэрытарыяльных, ні часавых межаў – радыяцыйныя, медыка-біялагічныя, сацыяльна-эканамічныя, сацыяльна-псіхалагічныя. З кожным годам выяўляюцца ўсё новыя межы трагедыі.

Чалавецтва не адчувае недахопу ва ўсё новых катастрофах, што адсоўвае аварыю дваццаціпяцігадовай даўніны на другі план. Аднак Беларусі, якая пацярпела больш за іншыя краіны, даводзіцца будаваць сваё жыццё з улікам маштабаў нацыянальнага бедства. Для нашай краіны праблемы адукацыі і асветы ў галіне радыяцыйнай бяспекі, радыебіялогіі і радыеэкалогіі, якія абумоўлены асаблівым цяжарам вынікаў катастрофы, маюць дзяржаўную значнасць, з'яўляюцца адной з састаўляючых сістэмы жыццезабеспячэння і рэабілітацыі дзяцей і моладзі, што пацярпелі ад аварыі на ЧАЭС. Навучыцца жыць і працаваць на забруджанай зямлі, каб дабіцца вытворчасці чыстай прадукцыі без шкоды свайму здароўю, – вось задача насельніцтва Беларусі. Работа па мінімізацыі наступстваў аварыі з мэтай рэабілітацыі забруджаных тэрыторый, іх адраджэння і ўстойлівага развіцця праводзіцца ў межах дзяржаўных праграмм (на 1990–1995 гг. і на перыяд да 2000 г.; на 2001–2005 гг. і на перыяд да 2010 г.; на 2006–2010 гг.; на 2011–2015 гг. і на перыяд да 2020 г.). Законы «Аб сацыяльнай абароне грамадзян, якія пацярпелі ад катастрофы на Чарнобыльскай АЭС» і «Аб прававым рэжыме тэрыторый, якія падвергліся радыеактыўнаму забруджванню ў выніку катастрофы на Чарнобыльскай АЭС» (1991 г.), «Аб радыяцыйнай бяспецы насельніцтва» (1998 г.), «Аб сацыяльнай абароне грамадзян, пацярпелых ад наступстваў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС і іншых радыяцыйных аварый» (2009 г.) прызначаны дапамагчы насельніцтву ў пераадоленні эканамічных, сацыяльна-псіхалагічных і медыцынскіх наступстваў аварыі.

Працэс асэнсавання і аналізу наступстваў катастрофы, вывучэнне становішча ў зоне трагедыі з кожным годам выклікае ўсё большую цікавасць у вучоных розных краін. За 25 гадоў, якія прайшлі пасля аварыі на Чарнобыльскай АЭС, праведзена шмат даследаванняў экалагічнага, медыцынскага, сацыяльна-псіхалагічнага характару. Сёння запатрабавана самая розная інфармацыя, звязаная з тэмай Чарнобыля. Бібліятэкі, як інфармацыйныя ўстановы, акумулююць і прадастаўляюць інфармацыю карыстальнікам. Нацыянальная бібліятэка Беларусі ўносіць пэўны ўклад у даследванне і вывучэнне чарнобыльскіх праблем . З 1993 г. у бібліятэцы ствараецца база даных «Чарнобыль» – самая першая з баз даных уласнай генерацыі бібліятэкі. Прызначана яна ў першую чаргу для інфармавання спецыялістаў розных галін народнай гаспадаркі аб дакументах па ўсіх аспектах чарнобыльскай катастрофы, мінімізацыі яе вынікаў, а таксама для азнаямлення насельніцтва раёнаў, якія пацярпелі ад катастрофы, з матэрыяламі пра радыяцыю і абарону ад яе з мэтай садзейнічання бяспечнай жыццядзейнасці на забруджаных тэрыторыях. На працягу свайго доўгага шляху, у сувязі з удасканальваннем тэхналогіі інфарматызацыі бібліятэчных працэсаў, база даных мянялася, але тым не менш працягвае папаўняцца бібліяграфічнымі запісамі.

У рабоце па стварэнні базы даных «Чарнобыль» прымалі ўдзел буйнейшыя бібліятэкі краіны: Цэнтральная навуковая бібліятэка імя Я. Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, Прэзідэнцкая бібліятэка Рэспублікі Беларусь, Беларуская сельскагаспадарчая бібліятэка імя І.С. Лупіновіча Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, Навуковая педагагічная бібліятэка Навукова-метадычнай установы «Нацыянальны інстытут адукацыі», Рэспубліканская навукова-тэхнічная бібліятэка, абласныя бібліятэкі.




З улікам таго, што ў краіне існуюць інфармацыйныя рэсурсы па розных аспектах чарнобыльскіх праблем, база даных «Чарнобыль» ставіць за мэту ў адпаведнасці з профілем бібліятэкі найбольш поўна адлюстроўваць бібліяграфічныя звесткі аб дакументах па пытаннях, якія датычацца грамадскіх і гуманітарных навук (сацыялогія, статыстыка, дэмаграфія, эканоміка, дзяржава і права, мастацкая літаратура і літаратуразнаўства, мастацтва і мастацтвазнаўства, рэлігія, псіхалогія). Такім чынам тэматычны змест робіць яе ўнікальным сродкам для пошуку літаратуры па менш традыцыйных аспектах («Чарнобыль у літаратуры і мастацтве», «Чарнобыль і царква»). Прыродазнаўчы, сельскагаспадарчы, медыцынскі і тэхнічны аспекты прадстаўлены ў асноўным літаратурай па агульных пытаннях, арганізацыйных праблемах, а таксама звесткамі аб публікацыях аналітычнага і падагульняючага характару. Па-за межамі базы даных застаюцца спецыяльныя навуковыя працы. База даных утрымлівае звесткі пра дакументы аб забруджаных тэрыторыях найбольш пацярпеўшых краін (Беларусь, Расія, Украіна), а таксама прастораў усяго свету, дзе адчуваецца ўздзеянне чарнобыльскай катастрофы, і тэрыторый, якія падвергліся ядзерным катастрофам, падобным да чарнобыльскай.

Матэрыялы, прадстаўленыя ў базе даных, павінны зацікавіць кіраўнікоў дзяржаўных і гаспадарчых арганізацый, спецыялістаў розных галін народнай гаспадаркі, занятых вызначэннем стратэгіі работы на бліжэйшы час і на перспектыву. Для іх будуць карыснымі дакументы па пытаннях наступстваў катастрофы і іх мінімізацыі; аб радыяцыйным становішчы ў канкрэтных раёнах; сацыяльна-эканамічным становішчы зоны павышанай радыяцыі; па пытаннях аздараўлення насельніцтва; заканадаўчыя дакументы, нарматыўныя акты міністэрстваў і ведамстваў па чарнобыльскіх пытаннях і каментарыі спецыялістаў да іх. Дакументы аб чарнобыльскіх грамадскіх арганізацыях і іх дзейнасці ў Беларусі і іншых краінах свету ў першыя гады пасля аварыі і ў цяперашні час будуць цікавымі для кіраўнікоў грамадскіх арганізацый. Вялікая колькасць дакументаў прысвечана дзейнасці міжнародных арганізацый па вырашэнні чарнобыльскіх праблем, міжнародным супрацоўніцтве, у прыватнасці з найбольш пацярпеўшымі ад наступстваў катастрофы дзяржавамі – Расіяй і Украінай, міжнародным праектам па комплексным аднаўленні забруджаных тэрыторый.

Настаўнікі знойдуць сцэнарыі мерапрыемстваў, урокаў, прысвечаных гадавінам чарнобыльскай падзеі. Працаўнікам сельскай гаспадаркі спатрэбяцца матэрыялы аб утрыманні радыенуклідаў у сельскагаспадарчай прадукцыі канкрэтных рэгіёнаў, парады па вядзенні раслінаводства, жывёлагадоўлі, лясной гаспадаркі на забруджаных тэрыторыях. Жыхары такіх тэрыторый змогуць атрымаць агульныя звесткі аб радыяцыі, яе ўздзеянні на арганізм чалавека, парады па ачышчэнні прадуктаў харчавання, па ўтрыманні хатняй жывёлы, працы на прысядзібным участку, выкарыстанні дароў лесу ва ўмовах радыяцыйнага забруджання, што будзе спрыяць бяспецы іх жыццядзейнасці ва ўмовах радыяцыйнага забруджання. Для спажыўцоў таксама будзе карыснай інфармацыя пра дакументы па сацыяльнай абароне грамадзян, якія пацярпелі ад чарнобыльскай катастрофы.

База даных «Чарнобыль» уключае цалкам ці ў выглядзе састаўной часткі бібліяграфічныя запісы на дакументы, выдадзеныя ў 1991–2006 гг.: кнігі (манаграфіі, зборнікі, даведачныя і статыстычныя выданні, тэзісы дакладаў, матэрыялы канферэнцый, сімпозіумаў), аўтарэфераты дысертацый, дысертацыі (з 1994 г. выдання); рэцэнзіі; главы і раздзелы з кніг, зборнікаў; перыядычныя выданні чарнобыльскай тэматыкі і артыкулы з іх (да 1995 г. – усіх газет, таксама беларускіх раённых); картаграфічныя выданні; ноты; творы выяўленчага мастацтва; машыначытаемыя носьбіты інфармацыі; а таксама звесткі з крыніц другаснай інфармацыі незалежна ад мовы, месца выдання. Бібліяграфічныя запісы прыводзяцца на мове даку-

ментаў. Пры неабходнасці запіс удакладняецца анатацыяй для канкрэтызацыі месца дзеяння, часу падзеі, прозвішчаў яе ўдзельнікаў.

Бібліяграфічныя запісы ствараюцца ў Беларускім камунікатыўным фармаце прадстаўлення бібліяграфічных запісаў у машыначытаемай форме (BELMARC). Створаныя раней у несумяшчальным з MARC-фарматам лакальным фармаце бібліятэкі запісы былі сканвертаваныя. На 01.01.2011 г. база даных «Чарнобыль» утрымлівала больш за 25 тыс. дакументаў.

У інфармацыйна-пошукавых сістэмах Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі сярод іншых тэматычных баз даных з аўтаматызаваных рабочых месцаў чытачоў арганізаваны доступ да базы даных «Чарнобыль». На партале бібліятэкі (www.nlb.by) праз раздзел «Інфармацыйныя рэсурсы» прадастаўлена магчымасць пошуку звестак у базе даных у аддаленым рэжыме. Пошукавая форма дазваляе знаходзіць дакументы альбо адразу па ўсіх элементах бібліяграфічнага запісу, альбо па адзінаму з выбраных тыпаў элементаў (аўтар, загаловак, тэма і г. д.). Дадаткова вынікі пошуку магчыма абмежаваць мовай, годам выдання. База даных зъяўляецца даведачнай, заказ дакументаў не ажыццяўляецца.

На аснове базы даных фарміраваліся аднайменныя навукова-дапаможныя паказальнікі: за 1991–2000 гг. – у электроннай і друкаванай форме, за 2001–2004 гг. – толькі ў электроннай форме. Бібліяграфічныя запісы ў паказальніках групуюцца па спецыяльна распрацаванай схеме, якая, захоўваючы свае асноўныя палажэнні, мянялася ў суадносінах з цягам развіцця падзей і адносінаў да іх. У раздзелах літаратура размешчана ў алфавітным парадку прозвішчаў аўтараў ці назваў твораў, асобна кірылічным і лацінскімі шрыфтамі. У канцы раздзелаў выдзелены бібліяграфічныя дапаможнікі. Астэрыскам (*) адзначаны публікацыі, не прагледжаныя de visu. Дакументы, якія знаходзяцца ў фондзе Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, пазначаны іх інвентарнымі нумарамі. Сувязь матэрыялаў розных раздзелаў і падраздзелаў паказана пры дапамозе сістэмы адсылак. Выданні забяспечаны імянным і геаграфічным дапаможнымі паказальнікамі, а таксама паказальнікамі матэрыялаў з'ездаў, канферэнцый, кангрэсаў, пасяджэнняў, сімпозіумаў, семінараў, бібліяграфічных крыніц; баз даных; назваў кніг, апісаных пад загалоўкам; перыядычных выданняў. Змест і прадмова дадзены паралельна на беларускай і англійскай мовах. Доступ да поўных тэкстаў навукова-дапаможных паказальнікаў «Чарнобыль» прадастаўлены з аўтаматызаваных рабочых месцаў карыстальнікаў Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі.

З 2007 г. у Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі фарміруецца камбінаваная шматгаліновая база даных «Беларусь: ад мінулага да сучаснага», у якой чарнобыльская тэматыка адлюстроўваецца ў суадносінах з прынцыпамі адбору дакументаў для гэтага інфармацыйнага рэсурсу.

У 2006 г. падрыхтавана электроннае выданне «Чарнобыль: інфармацыйна-бібліяграфічнае выданне: да 20-й гадавіны аварыі на Чарнобыльскай АЭС». Аснову інфармацыі, змешчанай на кампакт-дыску, складаюць выпускі навукова-дапаможнага паказальніка са звесткамі аб дакументах, выдадзеных у 1991–2003 гг. У якасці дадатку прыведзена інфармацыя аб найбольш актуальных інтэрнэт-рэсурсах, якія поўнасцю або часткова асвятляюць праблемы Чарнобыля. Бібліяграфічная


НАЦЫЯНАЛЬНАЯ БІБЛІЯТЭКА БЕЛАРУСІ

20 год Чарнобылю

ЧАРН БЫЛЬ
ЧОРН БИЛЬ
ЧЕРН БЫЛЬ

Інфармацыйна-бібліяграфічнае выданне

Мінск
2006

інфармацыя на CD-ROM прадстаўлена ў pdf-фармаце, прадугледжаны шматаспектны пошук.

Звесткі аб дакументах чарнобыльскай тэматыкі аператыўна адлюстроўваюцца на старонках штомесячнага бібліяграфічнага бюлетэня «Новыя кнігі: па старонках беларускага друку», што выдаецца Нацыянальнай бібліятэкай Беларусі. Сумным датам чарнобыльскай катастрофы прысвечаны бібліяграфічныя матэрыялы, размешчаныя ў дадатках бюлетэня (2006, № 3; 2011, № 2).

Анатаваны бібліяграфічны спіс «Боль Чарнобыля: урокі праз 25 гадоў» (2011, № 2, дадатак) уключае больш за 130 бібліяграфічных запісаў на дакументы (афіцыйныя, нарматыўна-прававыя, манаграфіі, матэрыялы навуковых канферэнцый, навукова-папулярныя, даведачныя, літаратурна-мастацкія, інфармацыйныя, выдадзеныя ў асноўным у 2006–2010 гг. Спіс складаецца з раздзелаў «Успаміны пра катастрофу, расказы аб ліквідатарах», «Наступствы чарнобыльскай катастрофы і барацьба з імі», «Шляхі рэабілітацыі чарнобыльскіх рэгіёнаў», «Палескі дзяржаўны радыяцыйна-экалагічны запаведнік», «Чарнобыль у літаратуры і фальклоры», «Чарнобыль у мастацтве» і будзе карысным навучэнцам і студэнтам, выкладчыкам агульнаадукацыйных школ, вышэйшых і сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў, спецыялістам розных галін народнай гаспадаркі, бібліятэкарам, а таксама ўсім, хто цікавіцца чарнобыльскай праблематыкай.

Інфармацыю аб чарнобыльскай катастрофе можна знайсці на сайтах:

http://www.chernobyl.by
http://new.chnpp.gov.ua/
http://chernobil.info/
http://pripyat.com/ru/
http://chernobyl.ucoz.es/


## Summary

In a material it is told about a creation in the National Library of Belarus the databases, devoted tragedy on the Chernobyl Nuclear Power Plant. Later 25 years from a moment of failure the process of judgement and analysis a consequences of accident it is interest scientists and citizens of the different countries.